**В.М.Бігеза**, *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

# WEB-САЙТЫ ЯК САСТАЎНАЯ ЧАСТКА ЭЛЕКТРОННЫХ РЭСУРСАЎ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК

Апошнія дзесяцігоддзі XX ст. характарызаваліся тэндэнцыяй прызнання сусветнай супольнасцю прыярытэтнасці правоў дзяцей, у тым ліку і на атрыманне інфармацыі, адукацыі і культурнае развіццё. Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці абвясціла гэта права (арт. 13, 17) [2].

Сёння па-ранейшаму застаецца актуальнай задача забеспячэння правоў дзіцяці на інфармацыю, запісаную на розных носьбітах, стварэння для дзяцей інфармацыйна насычанага асяроддзя. Вырашэнне яе ў значнай ступені звязана з падключэннем шэрага дзіцячых бібліятэк да Internet, пошукам і выкарыстаннем інфармацыі з дапамогай электронных рэсурсаў. Менавіта яны з'яўляюцца часткай мадэліруемага для дзіцячага чытача інфармацыйнага асяроддзя і характарызуюцца адкрытасцю ў лакальную і знешнюю інфармацыйную прастору дзіцячай бібліятэкі. Інтэрактыўнасць электронных рэсурсаў залежыць ад рухавасці і ўзаемаўплыву розных кампанентаў інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы для дзяцей.

Тэхнічныя ўмовы для фарміравання электронных рэсурсаў забяспечваюцца ўкараненнем у дзейнасць бібліятэк найноўшых інфармацыйных тэхналогій. Вывучэнне інфармацыйных патрэбнасцей чытачоў, а таксама асаблівасці выкарыстання дзецьмі камп'ютэрнай тэхнікі дазваляюць у некаторай ступені вызначыць кола электронных рэсурсаў бібліятэчнай галіны. Да іх належаць віртуальныя прадстаўніцтвы – web-сайты бібліятэк, электронныя каталогі (ЭК), базы даных (БД), звесткі аб складзе фондаў электронных дакументаў і асобных калекцый. У гэтым артыкуле разглядаецца адна з састаўных частак электронных рэсурсаў – web-сайты дзіцячых бібліятэк. Галоўная задача віртуальнага прадстаўніцтва – забяспечыць доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў, дапамагчы дзецям, падлеткам, юнацтву арыентавацца ў вялікім дакументальным патоку. У той жа час web-сайт мае яркую індывідуальнасць і дакладную адрасную накіраванасць [5], што,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

безумоўна, будзе выклікаць зацікаўленасць з боку патэнцыяльных карыстальнікаў электронных рэсурсаў.

Шматлікія дзіцячыя бібліятэкі, розныя па складу і аб'ёму сваіх фондаў, аўдыторыі карыстальнікаў, месцазнаходжанні, штату бібліятэчнага персаналу, маюць свае web-сайты, якія характарызуюцца рознай інфармацыйнай насычанасцю. Яны адрозніваюцца ўзроўнем інфармацыйнага сервісу, зместам асобных старонак, даступнасцю інфармацыі, функцыянальнасцю, выразнасцю афармлення.

З моманту з'яўлення сайтаў дзіцячых бібліятэк пытанні іх якасці, шляхі далейшага ўдасканалення былі ў цэнтры ўвагі іх стваральнікаў. Прадумвалася змястоўная структура бібліятэчнага web-сервера з улікам патрэбнасцей мяркуемай аўдыторыі, улічваліся існуючыя крытэрыі якасці web-сервераў, да якіх адносяцца глыбіня зместу, лёгкасць навігацыі; стабільнасць абнаўляемай інфармацыі; даступнасць для карыстальнікаў; адзіны дызайн раздзелаў і інш.

Як сцвярджаюць спецыялісты, што працуюць з дзецьмі, інфармацыя на сайце павінна абуджаць дзіцячую цікаўнасць, захапляць інфармацыйнымі і навігацыйнымі магчымасцямі сайта і такім чынам стымуляваць праяўленне ў дзяцей цікавасці да бібліятэкі, чытання, да новых інфармацыйных тэхналогій. Безумоўна, сайт дзіцячай бібліятэкі павінен быць прывабным і для дарослых, у першую чаргу бацькоў, настаўнікаў, бібліятэкараў дзіцячых бібліятэк [4, с. 33–34].

Сёння бібліятэчнае прадстаўніцтва дзеля вырашэння вышэйназванай праблемы можа выкарыстаць дакумент “Принципы web-сайтов по культуре. Руководство”, які распрацаваны ў рамках праекта Minerva (http:// www. Minervaplus.ru/docums/docums.htm) “Определение потребностей пользователей, содержания и критериев качества web-сайтов по культуре”. У ім разглядаюцца 10 найважнейшых прынцыпаў якасці, арыентаваных на web-сайты па культуры, у тым ліку і на бібліятэчныя сайты.

Як вядома, самай важнай рысай электроннага інфармацыйнага сервера з'яўляецца яго актуальнасць. Таму адміністрацыя бібліятэк зацікаўлена ў пастаянным абнаўленні інфармацыі, у зваротнай сувязі з карыстальнікамі. Гэта ў поўнай меры характэрна для сайтаў Расійскай дзяржаўнай дзіцячай бібліятэкі (РДДБ), Украінскай нацыянальнай дзіцячай бібліятэкі (УНДБ), Дзяржаўнай рэспубліканскай дзіцячай бібліятэкі Казахстана імя Бегаліна і інш.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ўключаюць цікавую і неабходную інфармацыю, што дапамагае ўстанавіць кантакты з дзецьмі ў віртуальнай прасторы.

Аналіз шэрага сайтаў дзіцячых бібліятэк сведчыць: шмат пастаўленых раней задач вырашана, аднак па-ранейшаму застаюцца актуальнымі праблемы даступнасці, глыбіні зместу, афармлення і інш.

Нягледзячы на мноства цікавых матэрыялаў, якія прапануюцца дзецям, мяркуем, што было б карысным прадстаўляць на сайтах розныя тэставыя трэнінгавыя заданні, якія садзейнічалі б інтэлектуальнаму і культурнаму развіццю карыстальнікаў, а таксама такія элементы, як рэкамендацыйную бібліяграфію, вэббліяграфію, электронныя віктарыны і выставы, гульні, чытацкія канферэнцыі, творы саміх карыстальнікаў, метадычныя матэрыялы для кіраўнікоў дзіцячага чытання (артыкулы, практыкумы, методыкі правядзення мерапрыемстваў), формы зваротнай сувязі (анкеты, інтэрактыўнае галасаванне і інш.). Сёння спецыялістамі ў галіне педагогікі, псіхалогіі распрацаваны шэраг інавацыйных методык у дапамогу настаўнікам, выхавацелям, і трэба выбраць з іх найбольш актуальныя і цікавыя менавіта для дзіцячых бібліятэк. Прадстаўленне інфармацыі на сайтах павінна адбывацца як мінімум на дзвюх мовах.

Прысутнасць на сайце электроннай рэкамендацыйнай бібліяграфіі вырашае пытанне прадастаўлення markings рознабаковай інфармацыі аб сучаснай літаратуры для дзяцей і прафесійных рэкамендацый у галіне кніжнага пошуку [3]. Што тычыцца вэббліяграфіі, то яна з’яўляецца своеасаблівым сродкам арыентацыі ў электронных рэсурсах з дапамогай прадастаўлення рэкамендуемага спіса сайтаў [1, с. 15].

Бібліятэкі Расіі і краін блізкага замежжа ўжо працяглы час выкарыстоўваюць Internet як адзін з інструментаў работы з карыстальнікамі-дзецьмі. Прыкладам можа служыць праект РДДБ “БібліяГід” (http://www.bibliogid.ru). Гэты праект з’яўляецца унікальным сайтам аб дзіцячым чытанні, ён створаны аддзелам рэкамендацыйнай бібліяграфіі РДДБ. Сайт арыентаваны, у першую чаргу, на кіраўнікоў дзіцячага чытання і адначасова даступны падлеткам. Яго галоўнымі задачамі з’яўляюцца рэгулярнае прадастаўленне як самай разнастайнай інфармацыі аб сучаснай літаратуры для дзяцей, так і прафесійных рэкамендацый у галіне кніжнага пошуку і фарміравання асноў культуры дзіцячага чытання [3]. Па выніках Усерасійскага конкурсу сайтаў публічных бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(2008) у намінацыі “Лепшы бібліятэчны Internet-праект” першая прэмія прысуджана менавіта гэтаму сайту.

Дзіцячыя бібліятэкі Беларусі знаходзяцца на пачатковым этапе працэсу стварэння віртуальных прадстаўніцтваў. Як вядома, у нашай краіне адсутнічае рэспубліканская дзіцячая бібліятэка, існуе адзіная Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска (18 дзіцячых бібліятэк), супрацоўнікі якой таксама шчыруюць на ніве стварэння сайта ДУ “ЦСДБ г. Мінска”. Праца над сайтам вялася сумесна з Internet-аген-цтвам “Сайтэкс”: абмяркоўваліся структура, назвы раздзелаў, рубрыкі, мастацкае афармленне і інш. Зараз сайт складаецца з 7 раздзелаў: гісторыя, бібліятэкі, паслугі, правілы, біблісвет, навіны, часопіс. Сайт поўнасцю беларускамоўны.

Галоўная старонка сайта ўключае наступныя рубрыкі: навіны бібліятэк, новыя паступленні, інфармацыйныя рэсурсы, гіперспасылкі – віртуальная даведка і асновы бяспекі ў Internet. Апошняя рубрыка ўяўляе сабою інтэрактыўны ў малюнках курс па Internet-бяспецы, які ўтрымлівае гульнявыя заданні і пытанні. Курс разлічаны на дзяцей 7–10 і 11–14 гадоў.

Названыя рубрыкі знаёмяць дзяцей з бягучымі мерапрыемствамі бібліятэкі, гіперспасылка “Класічная і сучасная мастацкая літаратура Беларусі і замежжа” адсылае да поўных электронных тэкстаў праграмных твораў. Рубрыкі прадстаўляюць інфармацыю аб правах і абавязках як чытачоў, так і бібліятэк перад чытачамі, новых паступленнях кніг, часопісаў, газет і месцы іх знаходжання, знаёмяць з гісторыяй стварэння сеткі дзіцячых бібліятэк, поўнай інфармацыяй аб паслугах, фондзе, інфармацыйных рэсурсах кожнай з 18 бібліятэк і 6 філіялаў.

Раздзел “Бібліясвет” знаёміць карыстальнікаў сайта больш падрабязна з кніжнымі і электроннымі паступленнямі: беларускімі, расійскімі, замежнымі, а з мая 2007 г. у гэтым раздзеле па ініцыятыве супрацоўнікаў аддзела бібліятэчнага маркетынгу змешчана інфармацыя аб кнігах, якія бібліятэкары дзіцячых бібліятэк раяць прачытаць дзецям, а таксама іх бацькам. Па сутнасці, названы раздзел з’яўляецца сапраўдным ілюстраваным анатаваным электронным даведнікам для дзяцей і дарослых.

Сёння бібліятэка ўдзельнічае ў Рэспубліканскім конкурсе web-сайтаў бібліятэк і ўстаноў бібліятэчнай адукацыі Рэспублікі Беларусь у дзвюх намінацыях: “Лепшы сайт дзіцяча-юнацкай і школьнай бібліятэкі” і “Лепшы сайт гарадской цэнтралізаванай сістэмы”, і па даных сайта Internet-статыстыкі “Акавіта” яе сайт у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першай намінацыі займае 14 месца ў рэйтынгу сярод 53 бібліятэчных сайтаў Беларусі.

Магілёўская АУНБ таксама адна з першых звярнула ўвагу на праблему стварэння сайта, прысвечанага дзіцячай бібліятэцы. Яе сайт вылучаюць маляўнічае афармленне і зручны інтэрфейс, зразумелы карыстальніку, а таксама карысная інфармацыя, змешчаная ў чатырох асноўных раздзелах: “Кнігі”, “Часопісы”, “Гэта цікава”, “Пра бібліятэку”.

Асаблівую цікавасць уяўляе раздзел “Кнігі”, які складаецца з чатырох частак і адлюстроўвае дакументны паток фонду дзіцячай бібліятэкі, у займальнай форме раскрывае фонд даведачнай і мастацкай літаратуры. Аднак неабходна адзначыць, што сайт знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі і не ўсе яго раздзелы функцыянальна завершаны. Мяркуем, што ў далейшым гэты сайт стане ў адзін рад з сайтам Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі г.Мінска, які на сёння з’яўляецца прыкладам паспяховай рэалізацыі праекта прадстаўлення рэальнай бібліятэкі ў віртуальным асяроддзі.

У XXI ст. наша краіна становіцца часткай сусветнага інфармацыйнага грамадства, у якім будуць жыць нашы дзеці. Гэта ставіць перад педагогамі, бібліятэкарамі, выхавацелямі новыя задачы, звязаныя з падрыхтоўкай новага пакалення да мультыкультурнага, інфармацыйнага свету. Удзел дзіцячых бібліятэк у стварэнні і выкарыстанні электронных рэсурсаў у пэўнай ступені дапаможа ў іх вырашэнні.

---


1. *Ганзикова, Г.* Навигатор в море информации: веблиография для детей и юношества / Г.Ганзикова // Библиотечное дело. – 2007. – № 7. – С. 15–17.

2. *Конвенция* ООН о правах ребёнка / ООН [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http: //www.un.org./Russian /documen/convents/childcon/htm/. – Дата доступа: 04.09.2009.

3. *Копейкин, А.А*. “БиблиоГид” – интернет-сайт о детском чтении [Электронный ресурс] / А.А. Копейкин. – М.: Российская гос. детская библиотека, 2002. – Режим доступа: http: //www.grntb.ru/win/inter–events/crimea 2002/trud/sec1121/ Doc 3.HTML. – Дата доступа: 04.09.2009.

4. *Кулагина, Н.И.* Web-страницы детских и юношеских библиотек как составная часть интернет-ресурсов для детей / Н.И.Кулагина // Мир библиографии. – 2003. – № 4. – С. 33–37.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Ситникова, О.В.* Web-сайты детских и юношеских библиотек как фактор развития чтения [Электронный ресурс] / О.В.Ситникова. – М.: Акад. переподгот. работников искусства, культуры и туризма, 2008. – Режим доступа: www.iliac. ru/win/inter-events/crimea2008/disk/176.pdf. – Дата доступа: 04.09.2009.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ